**ПАЎДНЁВАСЛАВЯНСКІЯ МОВЫ**, група славянскіх моў, распаўсюджаных галоўным чынам на Балканскім паўвостраве і прылеглай да яго тэрыторыі ў Славеніі, Харватыі, Сербіі, Македоніі, Босніі і Герцагавіне (каля 30 млн. чал.). Моўная супольнасць паўднёваславянскіх моў менш відавочная, чым заходнеславянскіх і ўсходнеславянскіх. Сучасныя паўднёваславянскія мовы дзеляцца на дзве адрозныя падгрупы: заходнюю (славенская, харвацкая, сербская мовы) і ўсходнюю (балгарская і македонская мовы). Магчымыя прычыны рэзкіх адрозненняў паміж імі: а) засяленне славянамі Балкан двума патокамі – усходнім і заходнім; б) істотны ўплыў на мову балгар і македонцаў тэрытарыяльна блізкіх неславянскіх народаў. Генетычна да П.м. адносіцца мёртвая стараславянская мова, а таксама шэраг мікрамоў (моў этнічных груп): гарадзішчанская (Аўстрыя), малізская і разьянская (Італія), прэкмурская (Славенія, Аўстрыя, Венгрыя), чакаўская і кайкаўская (Харватыя), банацка-балгарская (Румынія) і інш. П.м. маюць свае асаблівасці ў фаналогіі (наяўнасць монатанічнага націску – для моў усходняй падгрупы – і політанічнага націску – для моў заходняй падгрупы; пераход праславянскіх спалучэнняў *tort і *tolt у *trat* і *tlat*; пераход праславянскіх насавых *ą* і *ę* у галосныя *а* і *э*), лексікі (шматлікія запазычанні з турэцкай, грэчаскай, нямецкай, венгерскай, французскай, італьянскай і рускай моў) і граматыцы (складаная сістэма формаў прошлага часу; страта іменнага скланення і інфінітыву ў балгарскай і македонскай мовах; наяўнасць сістэмы скланення ў славенскай мове і некаторых гаворках сербскай і харвацкай моў і інш.). Паўднёваславянскія мовы маюць пэўнае падабенства з беларускай мовай, звязанае з шматвяковым уплывам царкоўнаславянскай кніжнай традыцыі на мовы ўсходніх славян, які праявіўся на ўсіх узроўнях моўнай сістэмы.

*Літ*.: Рагаўцоў В.І. Мовы свету: энцыклапедычны даведнік. Магілеў, 2009; Цыхун Г.А. Типологические проблемы балканославянского языкового ареала. Мн., 1981; Языки мира. Славянские языки. М., 2005.

*Д.В. Дзятко*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ